


НАВІНКІ КНІГАВЫДАННЯ

Пабачыў свет новы калектыўны зборнік пісьменнікаў Гродзенскай вобласці "У прыгаршчах Айчыны". Гэта выданне абавязана сваім нараджэннем ініцыятыве і падтрымцы Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама. У зборнік увайшлі творы фіналістаў Другога абласнога конкурсу рукапісаў ім. Цёткі (А.Пашкевіч), удзельнікі, якім па выніках галасавання экспертнай камісіі да перамогі не хапіла мінімальнай колькасці галасоў.

У кнігу ўвайшлі паэзія Ірыны Данік, Рамана Жытко, Людмілы Рахматулінай; проза Антона Піліпчыка і Таццяны Пяшко; творы для дзяцей Таццяны Сучковай, Наталлі Цвірко і Марата Гарданова. Унікальнай асаблівасцю конкурснага зборніка з'яўляецца ўключанае ў яго факсімільнае выданне заснавальніцы беларускай дзіцячай літаратуры Алаізы Сцяпанаўны Пашкевіч (Цёткі) "Першае чытанне для дзетак беларусаў".

«Галоўная мэта кнігі — прыцягнуць увагу беларускіх выдавецтваў і ўсіх зацікаўленых у папулярызацыі сучаснай беларускай літаратуры да творчасці пакуль малавядомых, але перспектыўных аўтараў, а таксама нагадаць пра нашу знакамітую зямлячку, якая ўсё сваё жыццё прысвяціла асветніцкай справе, асабліва дбаючы пра лёс беларусаў», — адзначыла ў прадмове да кнігі старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла Антонаўна Кебіч.

Выданне падрыхтавана ў ГАУПП «Гродзенская абласная друкарня». Наклад 500 паасобнікаў.

ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА